# Лёс мой—калгас

У Баханах добра ведаюць і паважаюць за працавітасць сціплую, немаладую ўжо жанчыну Афанассю Яфімаўну Чавусаву. Ніхто з жыхароў вёскі не прыпомніць, каб Хоня, як завуць Чавусаву яе равеснікі, а маладыя любоўна дабаўляюць да гэтага ласкавага імя слова «цётка», калі-небудзь адмовіла камусьці ў просьбе ці адказала груба на пытанне.

Ведае Афанасся Яфімаўна цану цёпламу, ласкаваму слову і ў час аказанай сардэчнай падтрымкі. Расла без бацькоў, усе пакуты сіроцтва зведала спаўна.

У час ваеннага ліхалецця памёр бацька, перажыўшы сваю жонку толькі на некалькі гадоў. Хоні ў той час было крыху больш дзесяці. Сіроцкую долю падзяліла Афанасся Яфімаўна з трыма сваімі сёстрамі і братамі. Спадзявацца не было на каго — пайшла дзяўчына працаваць у калгас. Ніякай работы не цуралася: працавала і на полі, і на ферме, з віламі і рыдлёўкай. Калі запісаць у адзін спіс усе работы, якія давялося перарабіць Афанассі Яфімаўне за свой доўгі працоўны век, дык атрымаецца тоўсты даведнік метадаў і відаў сялянскай працы.

— Зараз вакол трактары ды цялежкі, транспарцёры ды малакаправоды. А тады што было? — уздыхае А. Я. Чавусава. — Толькі на свае рукі і спадзяваліся. Прыйдзем, бывала, дамоў, ногі «гудуць», рукі пухлыя, нібы граблі, не сагнеш. Здавалася, прылегчы б, крыху ды хоць з закрытымі вачамі паляжаць. Ды дзе там! І дома ж гаспадарка, трэба спраўляцца.

Замуж я выйшла пасля вайны. Запрасіла печніка печ скласці. Атрымалася, што і печка ў мяне з'явілася і муж адначасова. Дочкі пайшлі адна за адной. Тры іх у мяне. То, бывала, на работу з сабою бяру кагосьці з іх, то дома пакідаю. Душа тады не на месцы — каб што не здарылася там, толькі і думаеш. І голад быў і холад, як кажуць. Нагараваліся, — хутка махнула рукой Афанасся Яфімаўна.

Але як бы цяжка ні было А. Я. Чавусавай, а дачкам сваім яна ўнушала, што чалавек заўжды павінен сумленна працаваць і сваёй працай здабываць сабе шчасце.

Зараз Таццяна, Валянціна і Надзея працуюць у розных кутках краіны, усе маюць вышэйшую адукацыю.

— Кожная справу выбрала па душы, — задаволена кажа Афанасся Яфімаўна. — Цяпер у нашай сям'і інжынеры і педагогі, паляводы і печнікі ёсць.

Дом Чавусавых знайсці няцяжка — ён такі адзіны ў Баханах: вялікі, цагляны, прыгожы, з шырокімі бліскучымі вокнамі.

Не хаваюць гаспадары, што будавалі яго з разлікам, што хтосьці з дачок застанецца ў роднай вёсцы. Але не збыліся мары бацькоў.

— Што ж, — гаворыць Афанасся Яфімаўна, — кожнаму сваё. Я вось як звязала свой лёс з калгасам, а адбылося гэта больш трыццаці гадоў таму назад, дык змяніць свайму выбару і па сённяшні дзень не маю сілы. Ды і не імкнуся, — усміхаецца жанчына. — Усё роўна не змагу!

**Н. САЛАБУТА.**



**На здымку: Афанасся Яфімаўна Чавусава, палявод калгаса «Чырвоны маяк».**

**Фота С. Бабровай.**

**Салабута, Н**. Лёс мой – калгас / Н. Салабута ; фота С. Бабровай // Шлях Кастрычніка. — 1988. — 1 студзеня. — С. 2.

*Афанасся Яфімаўна Чавусава, палявод калгаса "Чырвоны Маяк".*